УДК 94 : 379.81 «18/19» (476)

# СТАНАЎЛЕННЕ ПОЛАЦКА ЯК ЦЭНТРА РЭЛІГІЙНАГА ТУРЫЗМУ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**Зянько Аксана Леанідаўна**
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

*Даклад прысвечаны пытанню станаўлення і развіцця рэлігійнага турызму ў Полацку ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

Полацк – самы старажытны горад Беларусі з багатай гісторыка-культурнай спадчынай, аснова беларускай дзяржаўнасці, цэнтр духоўнай і рэлігійнай культуры. Яшчэ ў першай палове XIX ст. ён пачынае набываць вядомасць у Расійскай імперыі як «старажытны рускі горад», дзе засяроджана значная колькасць гістарычных помнікаў і хрысціянскіх святынь. Гэтаму спрыяла публікацыя краязнаўчых матэрыялаў Я.Ф. Канкрына, П.І. Кёпена, І.А. Гарыжскага, даследаванні Рускага геаграфічнага таварыства. Шырокі рэзананс мела паездка архіепіскапа полацкага Васіля (Лужынскага) у Маскву і Санкт-Пецярбург з крыжам Еўфрасінні Полацкай (1841) з мэтай збору сродкаў на рамонт храмаў адноўленай епархіі. «Падарожжа полацкага ўладыкі з унікальнай рэліквіяй па гарадах Расіі… значная падзея, якая ўскалыхнула цікавасць да заходнерускай гісторыі, да гісторыі Полацка і яго старажытнасцяў, што неадкладна адлюстравалася ў друку таго часу» [1, с. 57].

Рэалізацыя турыстычнага патэнцыялу горада актывізуецца ў другой палове XIX ст. Падзея, якая значна пасадзейнічала пераўтварэнню Полацка ў цэнтр паломніцтва і рэлігійнага турызму, стала перанясенне часткі мошчаў святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк (1871), якое адбылося па просьбе полацкага епіскапа Савы «у благаславенне і духоўнай засцярогі праваслаўнага насельніцтва Полацкай епархіі ад небяспечнага для чысціні праваслаўя ўплыву лацінскіх выдуманых святынь» [2, арк 1–1адв.]. Горад пачынаюць наведваць не толькі праваслаўныя паломнікі, але і даволі значная колькасць экскурсантаў, сярод якіх шмат навучэнцаў. Так папячыцель Віленскай навучальнай акругі Папоў В.А. у 1901 г. рэкамендаваў пры арганізацыі экскурсій для навучэнцаў з «рэлігійнымі і пазнавальнымі мэтамі» наведваць найперш Полацк: «Што датычыцца месцаў у межах г. Полацка і яго ваколіц, у якія могуць быць здзейснены экскурсіі, гэта: Сафійскі сабор, вядомы старажытнасцю і сваім гістарычным лёсам, у частцы горада, якая прылягае да гэтага сабора, так званыя “верхні і ніжні замкі”, жаночы Спаса-Еўфрасініеўскі манастыр, у якім знаходзіцца царква, пабудаваная прападобнай Еўфрасініей, частка яе мошчаў і крыж, створаны па яе загаду, у старажытны загарадны Барыса-Глебскі манастыр, мясцовасць за Дзвіною, якую называюць “Батарэя” (ад часоў 1812 г.), у сяло Струнь, у 6 вярстах ад Полацка, … на завяршэнне – у мясцовасць на рацэ Дзвіне, у 5 вярстах ад горада, дзе знаходзіцца камень Барыса. Настаўнік разам з вучнямі як у самім горадзе, так і пры наведванні манастыроў, акрамя задавальнення рэлігійнага пачуцця, знойдзе багаты матэрыял для размоў, як адносна дзяржаўнага жыцця старажытнай Русі, а таксама лёсу Полацка ў наступны час» [3, 76–76 адв.]. Так Полацк наведалі экскурсанты Мсціслаўскага гарадскога вучылішча, Віцебскай духоўнай семінарыі і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Полацк набывае асаблівую папулярнасць сярод паломнікаў і турыстаў у сувязі з перанясеннем у Полацкі Спаса-Еўфрасініеўскі жаночы манастыр мошчаў святой Еўфрасінні Полацкай у 1910 г. Удзельнікі падзей адзначаюць неверагодную колькасць людзей, якія прысутнічалі на ўрачыстасцях, не толькі з беларускіх зямель, але і са шматлікіх рэгіёнаў Расійскай імперыі. Напрыклад пратаірэй М. Мітроцкі адзначае, што на свяце ў Полацку сабраліся як праваслаўныя, так і яўрэі, каталікі, стараабрадцы, нават прадстаўнікі англіканскай царквы на чале з пастарам Г.Ж. Клінтанам [4].

У сувязі з гэтай знамянальнай падзеяй, для шматлікіх гасцей горада, упершыню на беларускіх землях былі выдадзены некалькі шляхаводнікаў: «Шляхаводнік па Полацку: да ўрачыстасці перанясення мошчаў прападобнай Еўфрасінні, княжны Полацкай, з Кіева ў Полацк», і «Цырыманіял сустрэчы, провадаў і праходжання мошчаў прапад. Еўфрасінні, княжны Полацкай, па Віцебскай губерні з кароткім шляхаводнікам па гор. Полацку, месцазнаходжаннем св. мошчаў». Першы створаны па прынцыпе даведачнай кнігі, на старонках якой змешчаны кароткі гістарычны нарыс і інфармацыя аб аб'ектах горада рознай накіраванасці: храмах і малітоўных дамах розных канфесій, гасцініцах, крамах, навучальных установах, аптэках і г.д. У ім таксама прыводзяцца цэны на прадукты харчавання і праезд, утрымліваецца карта горада [5]. Другі змяшчае падрабязны цырыманіял сустрэчы мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай для кожнага населенага пункта Віцебскай губерні і, акрамя аналагічнай даведачнай інфармацыі па Полацку, прадстаўляе пералік і апісанне яго славутасцяў, якія рэкамендуецца ўбачыць. У кнізе прыводзіцца пастанова Полацкай гарадской думы аб абмежаванні цэн на прадукты харчавання і праезд, уведзеныя з прычыны вялікага наплыву паломнікаў і турыстаў у горад [6].

У складзеным А.І. Шастовым «Апісанні экскурсій навучэнцаў Віленскай навучальнай акругі за 1910 год» адзначаецца, што 16 навучальных устаноў акругі здзейснілі 19 экскурсій-паломніцтваў. Сярод месцаў, куды адпраўляліся навучэнцы, горад Полацк і Полацкі Спаса-Еўфрасініеўскі жаночы манастыр стаялі на адным з першых месцаў [7, с. 37].

Экскурсіі па Полацку з наведваннем манастыроў і храмаў праводзіў таксама член Віцебскай вучонай архіўная камісіі І.І. Далгоў.

Штуршком для наведвання Полацка і яго славутасцяў, асабліва для навучэнцаў, стала святкаванне 100-годдзя перамогі ў вайне 1812 г. Цыркулярам ад 30 студзеня 1912 г. папячыцель Віленскай навучальнай акругі рэкамендаваў «у бягучым годзе ажыццяўляць экскурсіі ў гарады і мясцовасці, якія звязаны з успамінамі аб Айчыннай вайне 1812 г.» [8, арк. 16–16 адв.]. Полацк і яго наваколле якраз уваходзілі ў лік такіх мясцін. Так выхаванцы Ловажскай рамеснай школы, акрамя «наведвання мясцін, адзначаных геройскімі подзвігамі рускага войска», наведалі сабор Святога Мікалая, Полацкі Спаса-Еўфрасініеўскі жаночы манастыр, дзе «адслухалі малебен, прыкладаліся да мошчаў прападобнай Еўфрасінні, агледзелі храм і келлю» [9, арк. 160–162]. Прыкладна па такой жа праграме адбылося наведванне Полацка навучэнцамі Віцебскага рэальнага вучылішча, Слуцкай гімназіі, Маладзечненскай настаўніцкай семінарыі і інш.

Нягледзячы на паступовы адыход ад традыцыйнага грамадства, у другой палове XIX – пачатку XX ст. рэлігія прадаўжала адыгрываць значную ролю ў жыцці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

людзей. І калі са старажытнасці ўстойлівай традыцыяй з'яўляліся паломніцтвы, то ў другой палове XIX ст. пачынае распаўсюджвацца рэлігійны турызм. Сярод беларускіх гарадоў у такім кірунку пачынае вылучацца Полацк, які ў гэты час можа прапанаваць даволі значны комплекс гісторыка-культурных і рэлігійных аб'ектаў.

## Літаратура


1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 34825.
3. НГАБ. – Ф. 2597. Воп. 1. Спр. 30.
4. Митроцкий, М. Торжественное перенесение святых мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, из Киева в Полоцк (19 апреля – 22 мая 1910 года) / М. Митроцкий. – Киев : тип. Киево-Печерской Успенской лавры, 1913. – 69 с.
5. Путеводитель по городу Полоцку: к торжеству перенесения святых мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, из г. Киева в г. Полоцк. – Полоцк : издание Полоцкого церковного братства, 1910. – 24 с.
6. Церемониал встречи, проводов и следования св. мощей препод. Евфросинии, княжны Полоцкой, по Витебской губернии с кратким путеводителем по гор. Полоцку, местом положения св. мощей. – Витебск : издание Свято-Владимирского братства, 1910. – 29 с.
7. Шестов, А. И. Описание экскурсий учащихся Виленского учебного округа за 1910 г. / А. И. Шестов. – Вильня : изд. упр. Виленского учеб. окр., 1911. – 238 с.
8. НГАБ. – Ф. 2596. Воп. 1. Спр. 35.
9. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 567. Воп. 1. Спр. 2010.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова